**ЗАПРАШЭННЕ НА 35ю СУСТРЭЧУ БЕЛАРУСАЎ ПАЎНОЧНАЙ АМЕРЫКІ**

Згуртаваньне Беларусаў Канады (ЗБК) і Беларуска Амерыканскае Заадзіночаньне (БАЗА) ладзяць 35ю Сустрэчу Беларусаў Паўночнай Амерыкі 31 жніўня і 1 верасня 2024 ў Таронта (Канада). Традыцыя сустрэч беларускай дыяспары Канады і ЗША, што адбываюцца кожныя 2 гады, пачалася ў 1952 годзе, калі прадстаўнікі абедзвюх краінаў сабраліся на канадыйскім баку Ніагарскага вадаспаду.
Ва ўмовах палітычнага крызісу ў Беларусі і поўнамаштабнай вайны ва Ўкраіне, беларускія дыяспары па ўсім свеце праходзяць праз беспрэцэндэнтныя выпрабаванні, што вымагае значнага паляпшэння камунікацый, супрацы і аб’яднання сілаў дыяспары. З улікам гэтых абставінаў, мэтамі 35й Сустрэчы з’яўляецца наступнае:

1. Умацаванне чалавечага патэнцыялу беларускай дыяспары ў Паўночнай Амерыцы, інтэграцыя новапрыбылых імігрантаў у беларускія суполкі, захаванне пераемнасці і перадача ведаў паміж рознымі пакаленнямі дыяспары.

2. Прамоцыя камунікацый і супрацы паміж беларускімі нацыянальнымі арганізацыямі і бізнесамі ў Паўночнай Амерыцы, стварэнне трывалых аб’яднанняў паміж суполкамі беларусаў і ўсходнееўрапейскімі дыяспарамі, што падзяляюць блізкія беларусам каштоўнасці, напрыклад Украінскай, Польскай, Балтыйскімі дыяспарамі.

3. Абарона каштоўнасцяў незалежнай, дэмакратычнай Беларусі ў Канадзе і ЗША, данясенне дэмакратычных памкненняў беларускага народу да палітыкаў, суполак, дыяспараў, медыяў і навуковых колаў ў гэтых дзвюх краінах.

4. Інтэграцыя паўночна-амерыканскіх і еўрапескіх дыяспараў беларусаў, умацаванне сувязяў паміж дыяспаральнымі арганізацыямі і беларускімі дэмакратычнымі сіламі.

35я Сустрэча пройдзе ў пашыраным фармаце і прыме шмат новых дэлегатаў з ЗША, Канады і Еўропы. . У гэтым годзе партнёрамі Сустрэчы з’яўляюцца Асацыяцыя Беларусаў Амерыкі (ABA), Асацыяцыя Беларускага Бізнесу ў Замежжы (ABBA). GVA Lighting і Парафія Св. Кірылы Тураўскага.
31 жніўня Сустрэча будзе праходзіць на тэрыторыі паспяховай канадыйскай кампаніі GVA Lighting, сусветнага лідара ў вытворчасці інавацыйных, экалагічных сістэм асвятлення для архітэктурных аб’ектаў. Кампанія належыць беларускаму бізнесоўцу, сябру ЗБК і ABBA. Другі дзень сустрэчы, 1 верасня, адбудзецца ў памяшканні царквы Св. Кірылы Тураўскага.
Шчыра запрашаем актывістаў, бізнесоўцаў, прадстаўнікоў суполак і ўсіх сябраў вольнай, дэмакратычнай Беларусі з сяброўскіх дыяспаральных аб’яднанняў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы далучыцца да Сустрэчы. Калі ласка, рэгіструйцеся для ўдзелу ў Сустрэчы па спасылцы.

З павагай,
Аляксандра Логвін, Старшыня ЗБК, president@belarusians.ca
Наталля Федарэнка, Старшыня БАЗА, natallia.fedarenka@yahoo.com
Алена Лявончанка, Сакратар ЗБК, secretariat@belarusians.ca, +1 647 878 8740